**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у лютым**

**6 лютага. ЦБ.** У бібліятэцы прайшоў Дзень добрых спраў "Твори добро другим во благо» у рамках Дня спантаннай праявы дабрыні. У духоўна-асветніцкім цэнтры "Истоки" прайшла пазнавальная гадзіна "По пути к добру и свету». На мерапрыемстве прысутнічаў настаяцель храма Казанскай іконы Божай Маці (в.Рэдзігерава), іерэй Аляксандр Барысаў, які размаўляў з прысутнымі на тэму дабра, справядлівасці і добрых учынкаў.

Да **Дня юнага героя-антыфашыста** ў бібліятэках прайшлі патрыятычныя мерапрыемствы, былі аформлены тэматычныя кніжныя выставы. Так, **4 лютага ў Мікашэвіцкай г.б**. для вучняў 5 "А" класа СШ №1 ім. А.В. Зайчанка правялі літаратурна-музычную кампазіцыю "Дети трудных лет". Рабятам расказалі гісторыю гэтай памятнай даты. Падчас мерапрыемства ў выкананні юных слухачоў гучалі вершы, ваенныя музычныя кампазіцыі. Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з кнігамі з фонду бібліятэкі аб юных героях Вялікай Айчыннай вайны. А 6 лютага для вучняў 5 "Б" і 5 "В" класаў правялі інфармацыйную гадзіну "История маленького героя". **8 лютага** у **Дрэбскай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла патрыятычная гадзіна "Маленькие герои большой войны", у **Вулькаўскай-2** с.б. для выхаванцаў дзіцячага садка прайшла гутарка "Пионеры-герои", у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе адбылася літаратурна пазнавальная гадзіна "Маленькие герои большой войны".

**11 лютага. ЦДБ**. У рамках праекта «В мир книг через театр» прайшла творчая сустрэча першакласнікаў СШ №3 г. Лунінца з любімымі героямі казак. Пачалась сустрэча з экскурсіі па бібліятэцы. Потым дзеці здзейснілі вандроўку у мір казкі, бралі актыўны ўдзел у конкурсах і літаратурных віктарынах. Завяршылася мерапрыемства лялечным паказам. Увазе юных чытачоў была прапанавана казка "Теремок".

Прайшлі мерапрыемствы прысвячаныя **Дню воінаў-інтэрнацыяналістаў.**

**12 лютага. ЦБ.** У чытальнай зале адбылася дыялогавая пляцоўка "Необъявленная война. Трагедия и доблесть Афганистана". У мерапрыемстве прынялі ўдзел навучэнцы Лунінецкага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа і ветэраны баявых дзеянняў у Афганістане, воіны-інтэрнацыяналісты, пагранічнікі Грыцкевіч Віктар Іванавіч і Наварыч Іван Іванавіч. Бібліёграф расказала пра асноўныя прычыны ўводу савецкіх войскаў у Афганістан, прадставіла прэзентацыю "Аб дзевяці сынах зямлі Лунінецкай рэквіем гэты гучыць…". Ветэраны вайны ў Афганістане расказалі навучэнцам аб тым, як пачалася іх служба, як праходзіла падрыхтоўка да баявых дзеянняў у складаных прыродных умовах.

**15 лютага. ЦДБ.** У бібліятэцы прайшла сустрэча навучэнцаў 5 "Б" класа СШ №1 г.Лунінца з удзельнікамі баявых дзеянняў у Афганістане Бут-Гусаім Міхаілам Сяргеевічам, Пятрэнка Аляксандрам Сямёнавічам і Грыцкевічам Віктарам Іванавічам.

**15 лютага. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыуся вечар памяці "Вспоминая Афганистан" з удзелам вучняў 9 "В" класа СШ №2. Спачатку бібліятэкар расказала пра прычыны вайны ў Афганістане. Затым прысутныя праслухалі ўспаміны ўдзельнікаў гэтай вайны і вершы хлопцаў, якія ваявалі ў Аўганістане. Успомнілі і свайго зямляка Аляксандра Зайчанку, які не вярнуўся дадому.

У гэты ж дзень супрацоўнікі бібліятэкі разам са школьнікамі арганізавалі Маршрут памяці "Слава тебе, победитель — солдат!" Першая частка мерапрыемства, урок гісторыі, прайшоў ў бібліятэцы. Прысутныя даведаліся пра гісторыю стварэння помніка-мемарыяла воінам-афганцам у Мікашэвічах. У другой частцы здзейснілі Маршрут памяці непасрэдна да самога мемарыяла, дзе яшчэ раз узгадалі імёны 9 землякоў, якія не вярнуліся дадому, усклалі кветкі і ўшанавалі памяць загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках.

**15 лютага. Ракітненская с.б.** Адбылася сустрэча для школьнікаў "Афганистан отзывается болью". На мерапрыемства быў запрошаны намеснік Лунінецкай раённай арганізацыі ОО "Белорусский союз ветеранов войны в Афганистане" Мікалай Кавалец, воіны-інтэрнацыяналісты Мікалай Грэбень і Міхаіл Бут-Гусаім.

У **Кажан-Гарадокскай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшоў гістарычны экскурс "Из пламени Афганской войны" з удзелам воіна-інтэрнацыяналіста А.У. Міхайлоўскага.

У **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшоў літаратурна-музычны вечар "Афганистан: горячие секунды жизни". Бібліятэкар наведала на даму Кавалевіча Івана Паўлавіча, бацьку воіна-інтэрнацыяналіста Кавалевіча Паўла Іванавіча, загінуўшага ў Аўганістане.

З **10 па 15 лютага** ў бібліятэках раёна прайшла акцыя, прысвечаная **Дню дарэння кніг.** Правядзенне акцыі дазволіла папоўніць фонд бібліятэк раёна новай літаратурай: творамі класікаў сусветнай мастацкай літаратуры, сучасных аўтараў, дзіцячых пісьменнікаў, даведачнымі і энцыклапедычнымі выданнямі, навукова-папулярнай літаратурай.

**Мікашэвіцкая г.б**. Падчас дадатковых зімовых школьных канікул для малодшых школьнікаў у гарадской бібліятэцы прайшлі прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджанні надзвычайных сітуацый. **19 лютага** для вучняў 2-х класаў СШ №2 правялі пазнавальна-гульнявую праграму "Знатоки дорожной азбуки".

**20 лютага** для малодшых школьнікаў прайшла гульня-падарожжа "Безопасность нам нужна — безопасность нам важна". Пасля прагляда электроннай прэзентацыі "Чтобы не было беды" удзельнікі мерапрыемства ў ходзе дыскусійнай гутаркі абмяркавалі пытанні: "Чаму здараюцца пажары", "Што трэба рабіць пры пажары?" і інш.

**20 лютага. Лунінская с.б.** Супрацоўнікі сельскай бібліятэкі правялі пазнавальную гульню "Калейдоскоп профессий" для выхаванцаў дзіцячага садка аг.Палескі. У ходзе мерапрыемства дзяцей пазнаёмілі з рознымі прафесіямі ў гульнявой форме.

**20 лютага. Мікашэвічская г. б**. Адбылася чарговае паседжанне клуба па інтарэсах “Паэтычная глыбінка”. Літаратурная гасцёўня “Да людзей з любоўю” была прысвечана 90-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі **Рыгора Барадуліна**. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб асноўных вехах жыцця і творчасці народнага паэта, аб шматгранным таленце Барадуліна як паэта, перакладчыка, словатворца.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня роднай мовы**.

**21 лютага. ЦДБ**. У бібліятэцы прайшла гадзіна паэзіі “Мова-душа народа” для вучняў 4 “Б” класа СШ №1 г.Лунінца. Дзеці ўдзельнічалі ў турніры “Знаўцы беларускай мовы”, чыталі вершы, адгадвалі загадкі і спявалі песні. Дапоўніла мерапрыемства кніжная выстава і агляд літаратуры “21 лютага — Дзень роднай мовы”.

**21 лютага. ЦБ**. Адбылася паэтычная гасцёўня “Як дорага мне, мая родная мова». Для навучэнцаў СШ № 3 г.Лунінца імя Героя Савецкага Саюза А.У. Петрушэўскага чыталі свае творы вядомыя паэты Лунінеччыны Валянціна Трухнова і Віктар Пінігін. Усім прысутным прапанавалі віктарыну, дзе вучні паказалі выдатнае веданне роднай мовы. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі да мерапрыемства кніжную выставу “Роднай мове гучаць”.

**20-21 лютага. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных Міжнароднаму дню роднай мовы. У бібліятэцы прайшла акцыя “Чытаем і гаворым па-беларуску”. Для вучняў 5 “А” класа СШ №2 і вучняў 6 “А” класа СШ №1 імя А.Ў.Зайчанка правялі конкурсна-пазнавальную праграму “Беражыце родную мову”. З вучнямі 9 “А” класа СШ №1 імя Зайчанка правялі літаратурную гадзіну “Якая цудоўная родная мова”.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** для навучэнцаў 3-4 класаў пачатковай школы праведзена гадзіна славеснасці “Чарую душу родным словам”, у **Кажан-Гарадокскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла літаратурная гадзіна “На крылах роднай мовы”, у **Лахвенскай сельскай бібліятэцы** адбылася гульня-віктарына “Таямніца родных слоў” і інш.

**21 лютага. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі адбылася сустрэча працоўнага калектыву з адвакатам юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Тамарай Аляксееўнай Грыцкевіч на тэму “Имущественные права. Раздел имущества». На сустрэчы Тамара Аляксееўна падрабязна асвятліла прававыя пытанні ў рамках дзейнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якія тычацца падзелу сумесна нажытай маёмасці мужа і жонкі ў дабраахвотным, так і ў судовым парадку.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня абаронцаў Айчыны і Узброенных Сіл Рэспублікі Беларусь**

**20 лютага. Мікашэвіцкая г.б.** Для ўдзельнікаў клуба “САМИ” прайшла конкурсная праграма “Рыцарский турнир”. Мерапрыемства праходзіла ў форме камандных спаборніцтв. Усе актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах, адгадвалі загадкі, чыталі вершы, прысвечаныя святу, правяралі свае веды, адказваючы на пытанні віктарыны.

**21 лютага. ЦБ**. Прайшла сустрэча  намесніка начальніка Лунінецкага РАНС Валерыя Анатольевіча Свіжэўскага з навучэнцамі СШ №1 г.Лунінца. Ён расказаў пра свой прафесійны шлях і адказаў на пытанні школьнікаў.